**ГАНЬКОЎ Аляксандр Піліпавіч.** Нарадзіўся 2 красавіка 1953 г. у г. Брэсце ў сям'і ваеннаслужачага. Рускі. Скончыў факультэт фізвыхавання Брэсцкага педінстытута па спецыяльнасці "Фізічнае выхаванне" з наданнем кваліфікацыі "Настаўнік фізічнага выхавання" (1974), аспірантуру Беларускага інстытута фізічнай культуры (1987). Служыў у Савецкай Арміі (1974–1975). Працаваў інструктарам Брэсцкага абласнога савета "Дынама" (1976), інспектарам мытні (1976–1977), настаўнікам фізічнай культуры Прыбароўскай СШ Брэсцкага раёна (1977–1978), карэспандэнтам газеты "Заря" (1978–1979), інструктарам Брэсцкага абласнога камітэта ЛКСМБ (1979–1980), выкладчыкам Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута (1980–1984). З 1987 г. – выкладчык-стажор кафедры лёгкай атлетыкі, плавання і лыжнага спорту, з 1989 г. – асістэнт кафедры педагогікі, у 2002–2015 гг. – асістэнт кафедры фізічнай культуры Брэсцкага ўніверсітэта